■ Першае інтэрв'ю на новай пасадзе

СЁННЯШНЯЯ КУБА:
дасягненні сацыялізму і цікавінкі турызму

Быць паслом — нялёгкая праца. Многія думаюць, што гэта, перш за ўсё, дыпламатычная недатыкальнасць, прэстыж і проста добрае дасягненне ў жыцці. Аднак мой сённяшні суразмоўца, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь спадар Херарда СУАРЭС АЛЬВАРЭС пераканаў мяне, што гэта далёка не так. Ён нават пажартаваў, што, вобразна кажучы, ён працуе ў «дзве змены»: з 9 гадзін раніцы да 5 вечара займаецца справамі, звязанымі з Беларуссю, а затым з 6 вечара да 12 ночы (у гэты час на Кубе дзень толькі пачынаецца, розніца паміж Мінскам і Гаванай складае 8 гадзін) — з Кубай.

Фота Надзеі БУЖАН.

Як пасол стаў шахцёрам

Спадар Альварэс знаходзіцца ў Мінску толькі чатыры месяцы. Уручэнне даверных грамат Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь адбылося летась у снежні, і «Звязда» — гэта першае друкаванае выданне, якому ён даў эксклюзіўнае інтэрв'ю на новай пасадзе. Карыстаючыся выпадкам, спадар пасол павіншаваў чытачоў «Звязды» з Новым годам і з традыцыйным для нас старым Новым годам. Дарэчы, інтэрв'ю праходзіла на дзвюх мовах: іспанскай і рускай, якой мой суразмоўца валодае на дастаткова высокім узроўні.

— Напэўна, яшчэ да прыезду ў Мінск вы вывучалі інфармацыю пра Беларусь і ў вас склалася меркаванне пра нашу краіну. Якім яно было?

— Па справах, звязаных з працай, я быў у Мінску больш за 20 гадоў таму. На жаль, тады не было магчымасці блізка пазнаёміцца з краінай, аднак уражанні пра яе гісторыю, каштоўнасці, культуру засталіся вельмі добрыя. Здзівіў той факт, як Беларусь змагла падняцца пасля разбуральнай Вялікай Айчыннай вайны. Беларусь — братэрская краіна для Кубы, і я не магу сказаць, што яна была (або з'яўляецца) малазнаёмай для кубінскага народа.

— Што можаце сказаць пра Беларусь пасля чатырох месяцаў знаходжання тут у якасці кіраўніка кубінскай дыпламатычнай місіі?

— Калі я ўпершыню наведаў Беларусь, то ўбачыў толькі Мінск, а зараз маю магчымасць пазнаёміцца з рознымі рэгіёнамі вашай краіны. Бачу, што беларусы — гасцінны народ, а ў гарадах высокі ўзровень культуры. Пакуль у мяне яшчэ не было магчымасці ўбачыць прыродныя каштоўнасці Беларусі — напрыклад, Белавежскую пушчу, а таксама гістарычныя славутасці вашай краіны, аднак, спадзяюся, хутка такая магчымасць выпадзе.

Тым не менш, за мінулыя некалькі месяцаў знаходжання ў Беларусі я ўжо пабываў у Гомелі, Жодзіне, Салігорску. У Салігорску атрымаў вельмі незвычайны вопыт: спусціўся ў шахту «Беларуськалія» ў рабочай шахцёрскай вопратцы. І самае цікавае тое, што перш чым я афіцыйна ўступіў на пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Кубы ў Мінску, мне ўжо быў выдадзены сертыфікат шахцёра. Таму магу сказаць, што маё знаёмства з Беларуссю пачалося літаральна з самых глыбінь. Акрамя таго, я таксама наведаў прадпрыемства «БелАЗ» у Жодзіне і падняўся на самы высокі аўтамабіль грузападымальнасцю 450 тон — гэта ўнікальная машына!..

Сацыялізм на Кубе будзе жыць

— У апошнія гады ў СМІ шмат гаворыцца пра рэформы на Кубе: дазволена стварэнне прыватных прадпрыемстваў, скарачаецца колькасць дзяржаўных служачых… На што накіраваны гэтыя змены?

— Усё, што ў апошні час адбываецца ў нас, кубінцы называюць абнаўленнем існуючай сістэмы, яе ўдасканаленнем з мэтай адаптацыі сацыяльнай эканомікі краіны да існуючых умоў. Па-ранейшаму на Кубе застаецца курс на сацыялізм. Раней у нас была занадта цэнтралізаваная мадэль эканомікі, зараз ствараецца больш гнуткая сістэма.

Нельга забываць, што вельмі многімі сваімі дасягненнямі Куба абавязана менавіта сацыялістычнаму ладу. Дарэчы, 1 студзеня ў нас адзначаўся не толькі першы дзень новага года, але і 55-я гадавіна перамогі рэвалюцыі. Паводле даных ЮНЕСКА, наша краіна займае 51 месца па індэксе чалавечага развіцця: працягласць жыцця складае 80 гадоў, узровень смяротнасці сярод немаўлят адзін з самых нізкіх у свеце (4,2 выпадку на 1000 нованароджаных), самая вялікая колькасць урачоў на 1000 чалавек пры тым, што велізарная колькасць нашых работнікаў медыцынскай сферы працуе па ўсім свеце. Усё гэта было дасягнута насуперак палітыцы ЗША, якая падтрымлівае блакаду Кубы ўжо больш за 50 гадоў.

Што да прыватнага бізнесу, то цяпер у дробных прадпрыемствах і кааператывах задзейнічана каля 500 тысяч чалавек, аднак па-ранейшаму вядучай застаецца дзяржаўная форма ўласнасці.

На Кубе з'явяцца беларускія зборачныя прадпрыемствы

— Яшчэ ў 2012 годзе тавараабарот паміж нашымі краінамі перавысіў 100 мільёнаў долараў ЗША — для Беларусі і Кубы гэта рэкордны паказчык. На чым заснаваны гандлёвы абмен паміж нашымі краінамі? Якія яшчэ перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва можна назваць?

— З Беларусі на Кубу пастаўляецца шмат аўтобусаў, трактароў, абсталявання, запасных дэталяў, калійных угнаенняў. У Беларусь мы прадаём трысняговы цукар, лекавыя прэпараты. Акрамя таго, мы хацелі б развіваць нашы адносіны ў абмене сельскагаспадарчымі прадуктамі.

Мы сур'ёзна цікавімся эканамічнай мадэллю Беларусі, формай кіравання. У мінулым годзе абмяняліся з некаторымі кіраўнікамі інфармацыяй адносна кіравання рознымі прадпрыемствамі, міністэрствамі.

Таксама мы маглі б працаваць разам у сферы мадэрнізацыі прамысловасці. Куба плануе набыць у бліжэйшы час у Беларусі запасныя часткі для тэхнікі, ужо раней закупленай, — для тых жа аўтобусаў, трактароў, самазвалаў. У нас тысячы беларускіх трактароў, якія патрабуюць рамонту.

Куба і Беларусь зацікаўлены ў развіцці двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы медыцыны і фармакалогіі. За апошнія 20 гадоў на Кубе была створана буйная біятэхналагічная прамысловасць, якая распрацоўвае і вырабляе розныя медыкаменты і вакцыны.

— Як вы адзначылі раней, на Кубе ёсць шмат тэхнікі з Беларусі. Аднак краіны размешчаны ў розных канцах свету, і, адпаведна, транспарціроўка патрабуе вялікіх выдаткаў. Наколькі актуальна весці гаворку пра стварэнне ў вас сумеснага беларуска-кубінскага прадпрыемства па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі?

— На Кубе зараз працуюць над тым, каб была магчымасць рэгулярна рамантаваць, мадэрнізаваць беларускія трактары, аўтобусы. Таму можна сказаць, што ў нас развіваецца два кірункі: па-першае, купля беларускай тэхнікі, па-другое, праектаванне і стварэнне ў будучыні зборачных цэхаў (аўтобусаў, трактароў і дэталяў для тэхнікі). Некаторыя беларускія спецыялісты ўжо працуюць па гэтым кірунку на Кубе.

Партнёрства супраць хвароб

— Лічыцца, што кубінская медыцына — адна з лепшых у свеце. Вашы навукоўцы распрацавалі шэраг унікальных лекаў, у тым ліку супраць раку, дыябету. Якім бачыцца супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ў гэтай галіне?

— Сапраўды, кубінская медыцына — адна з самых развітых у свеце. Гэта было дасягнута дзякуючы сістэме бясплатнага медыцынскага абслугоўвання насельніцтва і дзейнасці нашых урачоў за межамі Рэспублікі Куба — у нас тысячы медыцынскіх работнікаў працуюць за мяжой.

ААН, а таксама Сусветная арганізацыя аховы здароўя, адзначылі асаблівыя дасягненні кубінскай медыцыны ў сферы біятэхналагічнай прамысловасці. Апошняя зараз распрацоўвае 90 розных медыцынскіх прэпаратаў, а яшчэ 60 праходзяць клінічныя выпрабаванні. Біятэхналагічная прамысловасць на Кубе мае 1200 патэнтаў. Сёння ажыццяўляецца продаж у іншыя краіны (каля 50 асноўных партнёраў) розных лекавых прэпаратаў і вакцын.

І Беларусь, і Куба зацікаўлены ў развіцці двухбаковага супрацоўніцтва не толькі па продажы і набыцці лекавых сродкаў, але і па стварэнні розных сумесных прадпрыемстваў. І гэта цалкам магчыма рэалізаваць у найбліжэйшай будучыні.

Новая Лацінская Амерыка: незалежнасць і інтэграцыя

— Куба многія гады выступае за збліжэнне краін лацінаамерыканскага кантынента. Раскажыце, калі ласка, пра цяперашнія палітычныя ініцыятывы Кубы ў арганізацыях, саюзах свайго рэгіёна?

— Сёння Куба і Лацінская Амерыка ідуць па шляху інтэграцыі, які ў свой час акрэслілі Сімон Балівар і Хасэ Марці. Можна сказаць, што ідзе новая хваля незалежнасці краін Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна. У пачатку гэтага стагоддзя былі створаны такія арганізацыі, як ALBA (альянс краін Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна, мэта якога — садзейнічанне гандлю і кааперацыі паміж яго ўдзельнікамі), «Петракарыбе» (арганізацыя, створаная Венесуэлай у 2005 годзе для льготных паставак нафты ў краіны Карыбскага басейна), СЕЛАК (найбуйнейшае рэгіянальнае аб'яднанне Заходняга паўшар'я, у склад якога не ўваходзяць Злучаныя Штаты і Канада). Апошняя арганізацыя была створана ўсяго два гады таму і аб'ядноўвае 33 краіны — гэта своеасаблівы пошук адзінства, нягледзячы на адрозненні гэтых краін.

28–29 студзеня ў Гаване пройдзе саміт краін — удзельніц СЕЛАК. У Лацінскай Амерыцы вельмі высокі ўзровень сацыяльнай няроўнасці, таму адна з задач саміту — разгледзець гэтае пытанне і распрацаваць праграму паступовага выкаранення праблемы.

Што такое «здаровы» турызм?

— Толькі за першае паўгоддзе 2013 года Кубу наведала больш за тысячу беларускіх турыстаў, і гэта толькі тыя, хто набываў турыстычныя пуцёўкі. Якія магчымасці супрацоўніцтва турыстычных ведамстваў нашых краін вы бачыце?

— Колькасць турыстаў, якія наведваюць Кубу, расце. Калі параўнаць інфармацыю за 2011 год, то летась менавіта беларусы сталі самымі актыўнымі турыстамі з усіх краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў — колькасць вашых суграмадзян прыкметна павялічылася.

Мы лічым, што галоўнае — гэта даць дастаткова інфармацыі пра магчымасці турызму на Кубе. Летась дэлегацыя пад кіраўніцтвам міністра спорту і турызму Беларусі Аляксандра Шамко наведала Кубу і прыняла ўдзел у турыстычным кірмашы. У красавіку гэтага года «Гаванатур» — найбуйнейшы кубінскі тураператар — прыме ўдзел у турыстычным кірмашы ў Мінску. Летась у Мінск прыязджаў намеснік міністра транспарту Кубы. На сустрэчах з беларускімі калегамі размова ішла аб стварэнні спрыяльных умоў для пералёту беларускіх турыстаў у Гавану.

Акрамя таго, распрацоўваюцца новыя турыстычныя пакеты. Тыя, хто жадае не толькі адпачыць, але і паправіць сваё здароўе, змогуць наведаць кубінскія санаторыі — так мы развіваем своеасаблівы «здаровы» турызм, які ўключае не толькі традыцыйны адпачынак на пляжы, але і лячэнне, рэабілітацыю.

Надзея ЮШКЕВІЧ

Даведка «Звязды»

Эканамічная блакада Кубы была ўстаноўлена ўрадам ЗША ў 1960 годзе. Паводле інфармацыі за 2013 год, эканамічны ўрон для краіны за ўсе гады блакады склаў 1,126 млрд долараў ЗША. Штаты забаранілі прадаваць на Кубу ўсе віды тавараў. Зараз блакада распаўсюджваецца, у тым ліку, на медыкаменты і абсталяванне. Дзеянні ЗША ў дачыненні да Кубы асуджае большасць краін свету (182 краіны з 193 дзяржаў — членаў ААН), у тым ліку краіны Еўрасаюза, Лацінскай Амерыкі і нават Канада — адзін з найбліжэйшых партнёраў Штатаў. Пачынаючы з 1992 года, Генеральная Асамблея ААН штогод прымае рэзалюцыю, якая заклікае ЗША адмяніць санкцыі.

Таленту — падтрымка

У Смаргоні нядаўна адбылася прэзентацыя паэтычнага зборніка, журналіста раённай газеты «Светлы шлях» Алы Страшынскай «Не пускайце ў сэрца адзіноту».

Выданню кнігі пасадзейнічала перамога ў першым абласным літаратурным конкурсе рукапісаў імя Цёткі.

Ініцыятыву абласнога аддзялення «Саюза пісьменнікаў Беларусі» аб правядзенні конкурсу, які скіраваны на праяўленне літаратурных талентаў, падтрымаў Гродзенскі аблвыканкам. Пры гэтым было вырашана, што грашовая прэмія пераможцам у розных намінацыях (паэзія, проза і дзіцячая літаратура або публіцыстыка, літаратурная крытыка, сатыра і гумар) павінна выкарыстоўвацца на выданне кніг. Лаўрэатамі першага конкурсу, акрамя Алы Страшынскай, сталі Ніна Рыбік з Астраўца і гродзенец Аляксандр Слашчоў. А ўвогуле на суд экспертнай літаратурнай камісіі былі прадстаўлены 22 рукапісы. Дарэчы, на гэтым творчая акцыя не скончыцца: ужо аб'яўлены другі конкурс.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

БОЛЬШ ЗА 200 ТЫСЯЧ ВЕРНІКАЎ

па неафіцыйнай інфармацыі наведалі за тры дні Дары валхвоў у сталічным Доме міласэрнасці. У першы ж дзень пакланіцца святыні прыбыло без малога 40 тысяч вернікаў. На другі дзень — 18 студзеня — святыню наведала 77 тысяч чалавек, яшчэ больш за 60 тысяч прыйшлі 19 студзеня, паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама. За прайшоўшыя дні, можна меркаваць, колькасць ахвотных пакланіцца Дарам не зменшылася. Так што, насамрэч, гаворка можа ісці і пра большую лічбу, чым 200 тысяч.

Сяргей РАСОЛЬКА.